# СТРАТЭГІЧНЫЯ ПАМЫЛКІ А. ГІТЛЕРА Ў ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЕ

Толмач К.Дз.
Навуковы кіраўнік: канд. гіст. навук, дацэнт Лепеш А.В., БНТУ

Перамога ў Другой сусветнай вайне над Германіей была, галоўным чынам, забяспечана моцным рухам супраціўлення на захопленых тэрыторыях. Але, на мой погляд, перамозе саюзнікаў “дапамаглі” таксама стратэгічныя памылкі, якія дапусціў А. Гітлер падчас Другой сусветнай вайны. Ён перааценіў свае сілы на пачатку распрацаванай стратэгіі. Яго саманадзейнасць прывяла да краху аперацыі “маланкавай вайны”, на якую ён разлічваў да апошняга. Гітлер навязваў ідэю «перавагі толькі адной нацыі». Ён ішоў па шляху знішчэння іншых народаў. Ён падняў супраць сябе не толькі іншаземныя ўрады, але і ўсе грамадскія інтэрнацыянальныя арганізацыі свету. Гэтым А. Гітлер забяспечыў сабе рэлігійную і сацыяльную варожасць усяго свету. Гітлер паўтарыў стратэгічную памылку 1914-1918 гг. Ён бязмерна расцягнуў свой фронт ад нарвежскіх фіёрдаў, праз Данію, Галандыю, Брэтань, Марсэль, Італію, Афрыку, Грэцыю, Крым, Каўказ, Волгу і да Петраграда. Гэта была стратэгічная манія вялікасці, якая рабіла бяздзейнасным асноўны прынцып: быць у вырашальны момант мацней суперніка. Пралік А.Гітлера назіраўся ў даволі рэзкім спыненні аперацыі “Марскі леў”, якая магчыма магла б і прынесці перамогу Германіі над Англіяй. Больш за тое, Германія мела досыць слабых саюзнікаў. Напрыклад, неваяўнічая Італія і небяспечная Румынія. Стратэгічна слабы саюзнік ёсць заўсёды цяжар і небяспека. А. Гітлер пайшоў на СССР, не ведаючы рускага народа, яго прасторы, яго клімату, яго побыту і яго сацыяльных адносін. Вайсковая гісторыя выкрые яшчэ і іншыя памылкі яго камандавання. Увогуле памылкі А. Гітлера спрасцілі перамогу заходніх краін і СССР над фашысцкай Германіяй.